*Славяна Шамякіна*

# АБ ВЫКЛАДАННІ МІФАЛОГІІ І ФАЛЬКЛОРУ Ў ВНУ

Сярод базавых філалагічных дысцыплін важнае значэнне для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў маюць міфалогія і фальклрыстыка. Міфалогія выкладаецца на ўсіх спецыяльнасцях філалагічнага факультэта БДУ. Аднак на яе вывучэнне адводзіцца, на нашу думку, зусім мала гадзін – усяго 34 аўдыторных. І выкладаецца яна на працягу аднаго семестра, як і фальклрыстыка. Апошняя ж увогуле як асобная дысцыпліна існуе толькі на трох аддзяленнях – беларускім, рускім і славянскім. Лічу неабходным патлумачыць, чаму такая сітуацыя падаецца мне не проста дрэннай, а ў некаторым сэнсе нават ненармальнай і парадаксальнай.

Міфалогія – асобная форма свядомасці, побач з навукай, філасофіяй і мастацтвам. Фальклор – самастойная форма культуры, від мастацтва, прадстаўлены ў вельмі вялікім аб'ёме. Але ж філасофія  і іншыя віды мастацтва ў розных формах і ў рознай ступені выкладаюцца ў шматлікіх ВНУ на розных факультэтах. Існуюць цэлыя асобныя факультэты і нават універсітэты для іх вывучэння. Навукамі займаюцца, зразумела, ва ўсіх навучальных установах. Міфалогія ж і фальклор вывучаюцца на вельмі абмежаванай колькасці факультэтаў і ў вельмі невялікім аб'ёме.

Міфалогія – самая старажытная форма свядомасці, узнікла яшчэ ў палеаліце, хутчэй за ўсё, раней за ўсе іншыя спосабы асэнсавання рэчаіснасці. Таксама і фальклор – адзін з самых старажытных відаў мастацтва. Пры гэтым як міфалогія, так і фальклор працягваюць сваё існаванне, і ўвогуле ніколі не спынялі свайго актыўнага функцыянавання. Такім чынам, з усіх форм культуры менавіта міфалогія і фальклор  прайшлі самы доўгі перыяд развіцця.

Міфалогія і фальклор існуюць абсалютна ва ўсіх народаў свету, у той час як навука, філасофія, многія іншыя віды мастацтва – толькі ў так званых «цывілізаваных» народаў. Такім чынам, міфалогія і фальклор – самыя ўсеагульныя і распаўсюджаныя формы культуры.

Міфалогія аказала велізарны ўплыў на іншыя формы свядомасці – намнога большы, чым яны на яе. Можна з вялікай доляй упэўненасці нават выказаць гіпотэзу, што ўсе іншыя формы культуры бяруць свой пачатак у міфалогіі. Фальклор непарыўна звязаны з іншымі народнымі відамі мастацтва (дэкаратыўна-прыкладным, народнай архітэктурай і г. д.), ён мае найвялікшае значэнне ва ўзнікненні і развіцці мастацкай літаратуры, аказаў значны ўплыў і на іншыя віды мастацтва.

Іншыя формы культуры – большая іх частка – асноўнай масай насельніцтва толькі пасіўна спажываюцца: праглядаюцца, чытаюцца, праслухоўваюцца. У той час як міфалагічныя архетыпы, якія існуюць у падсвядомасці кожнага чалавека, аказваюць значны ўплыў на яго псіхалогію

і ўчынкі. Як паказваюць сучасныя даследаванні, міфалагічная свядомасць у большай ці меншай ступені праяўляецца ва ўсіх людзей, хоць большасць гэтага і не разумее. Таксама абсалютна кожны чалавек можа быць носьбітам фальклорнай традыцыі, іграць ролю ў бытаванні фальклорных твораў, ствараць іх новыя варыянты.

Такім чынам, на сённяшні момант мы маем наступную сітуацыю: асобная форма свядомасці (міфалогія) і самастойны від мастацтва (фальклор), што прайшлі самы доўгі шлях развіцця, аказалі ўплыў на ўсе іншыя формы культуры і самыя распаўсюджаныя, – вывучаюцца намнога менш за ўсе іншыя. Сітуацыя, на наш погляд, цалкам ненармальная. На самай справе, міфалагічных дадзеных і фальклорных твораў з культур розных народаў, верагодна, хапіла б на тое, каб вывучаць іх на асобным факультэце! Як мінімум на асобным аддзяленні. У нас жа міфалогія і фальклор выкладаюцца на працягу аднаго семестра. Мяркуем, што першым крокам па пераадоленні гэтай парадаксальнай сітуацыі магло б стаць хаця б увядзенне праграмы выкладання дадзеных дысцыплін на філалагічным факультэце БДУ на працягу двух семестраў. У першым семестры выкладалася б тэорыя міфалогіі: асаблівасці гэтай формы свядомасці, тыпы міфаў, параўнальны аналіз міфалогій розных народаў свету. У другім семестры вывучаліся б нацыянальныя міфалогіі паводле спецыялізацыі аддзяленняў (славянская міфалогія на беларускім, рускім і славянскім аддзяленнях, усходняя міфалогія на аддзяленні ўсходняй філалогіі, міфалогія народаў Заходняй Еўропы – на рамана-германскім). Таксама і фальклор: у першым семестры вывучалася б тэорыя фальклору (яго асаблівасці як мастацтва, віды, жанры і г. д.), у другім – нацыянальны фальклор тых народаў, мову і літаратуру якіх выкладаюць на адпаведных аддзяленнях. На самай справе, як, напрыклад, выкладаюцца мова і літаратура? Ёсць асобныя дысцыпліны Тэорыя літаратуры і Агульнае мовазнаўства, якія даюць агульныя тэарэтычныя веды аб дадзеных прадметах. А ёсць дысцыпліны, якія вывучаюць асобныя нацыянальныя мовы і літаратуры. Пры выкладанні міфалогіі і фальклору пакуль што прыходзіцца змешваць тэорыю і канкрэтныя міфалогіі і нацыянальныя фальклорныя традыцыі ў адно, прычым у вельмі невялікім аб’ёме. Наконт фальклору ўзнікаюць дадатковыя праблемы з-за таго, што на многіх аддзяленнях (рамана-германскай, усходняй, класічнай філалогіі) ён увогуле не выкладаецца. У выніку студэнты не разумеюць асаблівасці дадзенага віду мастацтва, не ведаюць пра фальклор тых краін, мову і літаратуру якіх вывучаюць, і не здольны правільна прааналізаваць літаратурныя творы, у якіх назіраецца ўплыў фальклору.

Такім чынам, той узровень выкладання міфалогіі і фальклору, які назіраецца на філалагічным факультэце на сённяшні дзень, не адпавядае важнасці і значнасці дадзеных дысцыплін. Але гэта залежыць не ад выкладчыкаў, а ад той колькасці.